**«Правы чалавека «на пальцах» прыедуць у Гродна 26 лютага!**

Правы Чалавека — што гэта і для каго? Чым насамрэч займаюцца праваабаронцы? Хочаце ведаць, як абараніць сябе ад несправядлівасці і чаму праваабаронцы — гэта не апазіцыя? **Падавайце заяўкі! Дэдлайн 25.02 уключна.**

**Пра што праграма?**

Падчас двухгадзіннага семінара мы пагутарым пра гісторыю і ідэі, на якіх грунтуюцца Правы Чалавека. Зразумеем, калі нашы правы парушаюцца, а калі не і якія існуюць механізмы іх абароны.

Таксама мы паразважаем аб прынцыповай розніцы паміж праваабаронцамі і палітыкамі, талерантнасці, большасці і меншасці, свабодзе і пра тое, што Правы Чалавека — гэта вельмі канкрэтныя рэчы.

**Дзе і калі адбудзецца?**

Семінар пройдзе **26 лютага 2014 (серада)** ў Гродне. Пачатак а 18.30. Працягласць каля 2 гадзін. Дакладнае месца правядзення будзе паведамлена пасля рэгістрацыі.

Анлайн-заяўку **запаўняйце тут**. Дэдлайн падачы заявак **25 лютага 2014** уключна.

Да ўдзелу ў праграме запрашаюцца беларуская моладзь і студэнты, а таксама ўсе жадаючыя да 35 гадоў уключна, незалежна ад сацыяльнага становішча, веравызнання і г.д.

**Увага! Пры запаўненні анкеты вы згаджаецеся з правілам поўнага ўдзелу ў семінары.** Звярніце ўвагу, што ў нас няма магчымасці кампенсаваць праезд.

**Бонус для ўдзельнікаў**

Для тых, хто паспяхова пройдзе дадзены семінар, прадугледжана паглыбленае навучанне, а таксама іншыя прапановы ў галіне адукацыі правах чалавека, стажыроўкі і ўдзел у дзейнасці беларускіх і міжнародных праваабарончых і моладзевых арганізацый.

**«Правы Чалавека «на пальцах»** — сталая асветніцкая праграма па Правах Чалавека для пачаткоўцаў. Падчас праграмы задаецца і ўзнікае шмат пытанняў, над якімі прапануецца паразважаць самастойна, а таксама з іншымі ўдзельнікамі і трэнерамі. Праграма з'яўляецца часткай Міжнароднай школы Правоў Чалавека і грамадзянскіх дзеянняў.

Па ўсіх пытаннях пішыце на belmpd@gmail.com.

Далучайцеся да нас Укантакце, Facebook, Twitter, Instagram, Youtube.